

Леанід Лаўрэш

# Нагародавічы

Нагародавічы ў XVI – пачатку XVII ст. уласнасць сям'і Вельямінаў-Руцкіх. "Слоўнік геаграфічны..." піша, што тут адбыўся першы з'езд уніяцкай капітулы пад кіраўніцтвам мітрапаліта Іосіфа Руцкога. Першая драўляная царква была так сама пабудавана мітрапалітам Руцкім, аб чым сведчылі дакументы якія знаходзіліся ў царкве яшчэ на пачатку XX ст. Пра царкву "Слоўнік геаграфічны..." паведамляе, што да перабудовы 1894 г. яна захоўвала свой першапачатковы выгляд *(Słownik Geograficzny Królewstwa Polskiego... Warszawa. 1895. T. 14. S. 558.).*

Гісторык Жуковіч П.Н. цытуючы першага біёграфа мітрапаліта Руцкога Рафаіла Корсака паведамляў: *"Руцкі прыйшоў да думкі пра неабходнасць больш трывалай пастаноўкі ўсёй справы ўладкавання жыцця манахаў, каб пасля яго смерці справы не прыпыніліся. З гэтай мэтай ён склаў статут Базыліянскага ордэна і на Нагародавіцкай кангрэгацыі палажыў заснаванне самага ордэна".* І далей: *"Як вядома, толькі да часу першай (Нагародавіцкай) базыльянскай кангрэгацыі 1617 г. Руцкі напісаў ...першы том правілаў манаскага жыцця".* У дакументе ўніяцкай царквы 1824 г. "О средствах умножения в Греко-униатском духовенстве просвещения" ёсць такі адрывак: *"Каля 1615 г. уніяцкі мітрапаліт Іосіф Вельямін Руцкі задумаў даць іншае ўладкаванне цэлай рускай іерархіі і ўсёй адукацыі духавенства. ...Таму па радзе езуітаў і па ўзору іх ордэна ён даручыў ордэну базыльянаў клопат аб свецкіх вучылішчах і на гэта атрымаў дазвол у папы Паўла V. 3 снежня 1615 г. ...мітрапаліт завёў такія вучылішча, а ў 1617 г. яны ўжо былі ў Навагрудку і ў Менску, як сведчыць пра гэта першы базыльянскі сход які адбыўся ў Навагародзічах (тут памылка – Нагародавічах, – Л.Л.)" (Жукович П.Н. Жизнеописание митр. Иосиф Вельямина Рутского, составленное митр. Рафаилом Корсаком, и сочинение Рутского об улучшении внутреннего строя униатской церкви / П.Н. Жукович // Христианское чтение. – 1909. № 8-9. С. 1099–1102.).* Цалкам, матэрыялы Першай Нагародавіцкай кангрэгацыі надрукаваны ў Т. 12 "Археографического сборника документов, издаваемого при управлении Виленского учебного округа".

У купчай ад 26 кастрычніка 1635 г., якая была складзена пры продажы мітрапалітам Руцкім фальварка Нагародавічы Яну Булгаку, напісана: *"в держанье … подали есьмо фольваркъ нашъ, … зъ церковью въ томъ фольварку, до которое церкви и грунту придано волокъ пулторы, то есть: подъ священником волока одна, а под подданымъ его полъ волоки, которая то церковь вечными часы застовати маетъ…" (АВАК. Т.11. Вильна. 1880. С.114.).*

У 1635 г. Нагародавічы мітрапалітам Іосіфам Руцкім былі прададзеныя Булгакам. Потым сталі маёмасцю Сурынаў, Тызенгаўзаў, Глухоўскіх. У XVIII ст. Нагародавічы купляе генерал Мараўскі жонка якога была сястрой Караля Радзівіла "Пане каханку".

Маёмасць генерала была прададзеная за даўгі і гаспадыняй стала старасціна Ленская а з 1820 г. маёмасць пераходзіць Дмахоўскім. У Нагародавічах жыў **Вінцэнт Дмахоўскі** (1807–1862) – мастак, вучань Яна Рустэма і Казіміра Ельскага, удзельнік паўстання 1831 г. Нарадзіўся ў маёнтку Гаўя (належаў Брахоцкім) Ашмянскага павету. Належаў да герба Побуг, быў жанаты з паннай Саламеяй Арлоўскай якая паходзіла з Каралеўства Польскага. Аднак маёнтак па смерці бацькоў Вінцэнта перайшоў да яго нежанатага старэйшага брата, пасля смерці якога ўладальнікам Нагародавіч стаў сын Вінцэнта Дмахоўскага – Уладзіслаў *(Bieliński Józef. Uniwersytet Wileński. Kraków. 1899 – 1900. T. II. S. 747.).*

Пачатковую адукацыю Вінцэнт атрымаў у піярскім вучылішчы ў Шчучыне (па некаторых звестках вучыўся у Навагрудку.) і ў 1826 г. паступіў у Віленскі ўніверсітэт на філалагічны факультэт. Для шляхты лічылася прэстыжным атрымаць адукацыю юрыста, філосафа або літаратара. Разам з наведваннем лекцый на філалагічным факультэце, Вінцэнт бярэ ўрокі малявання ў Яна Рустэма. Жывучы сярод студэнтаў, будучы мастак удзельнічаў у абмяркаванні пытанняў літаратуры і мастацтва, духоўнай чысціні асобы. Спрэчкі разгараліся вакол рэвалюцыі ў Францыі, пра намер цара Мікалая I задушыць яе штыкамі польскага войска. Думкі прыводзілі да неабходнасці вызваленчай вайны палякаў разам з рускімі супраць царызму — «за нашу і вашу вольнасць». Вінцэнт асабіста ведаў Міцкевіча і яго сяброў, у яголных Нагародавічах гасцяваў **Адам Міцкевіч** *(Chlopicki, E. Kartki z teki podróżnej // Klosy.– 1869.– № 9.– S. 404.).*



Вінцэнт Дмахоўскі. Замак у Гальшанах, 1853.

У 1829 г. Дмахоўскі кінуў навучанне ва ўніверсітэце, не закончыўшы поўны курс навук.

У лістападзе 1830 г. пачалося паўстанне ў Польшчы, якое перакінулася на Беларусь, Літву і Украіну. Вінцэнт Дмахоўскі апынуўся ў шэрагах паўстанцаў. Да канца лета 1831 г. царскія войскі разбілі паўстанцаў у Менскай і Віленскай губернях. Ратуючыся ад пераследаванняў, Вінцэнт эміграваў ва Усходнюю Прусію, і тут мена віта ўменне маляваць давала надзейны кавалак хлеба.

У 1837 г. цар аб'явіў амністыю былым паўстанцам. Вінцэнт Дмахоўскі вярнуўся ў Вільню і прафесійна заняўся мастацтвам. У гэтыя часы з'явілася карціна на гістарычную тэму — «Крыжакі пры аблозе цвердзі Пуня». Ён часта наведваўся свой маёнтак Нагародавічы і маляваў родныя мясціны Навагрудчыны. У 1843 годзе з'явілася карціна «Радзіма» («Двор у Нагародавічах»): прасторны фальваркавы двор, зарослы гусінаю траўкаю і дробнымі пахучымі рамонкамі. Пад наглядам нянек гуляюць дзеці. Пасуцца куры і снежна бялеюць на гладзі рачулкі гусі. Сушыцца вымытае адзенне і бялізна. Удалечыні, у карэтніку, расчыненны дзверы. Праз іх відаць аглоблі брычкі. У цяні – звычайны сялянскі воз. А яшчэ крыху далей – аднапавярховы драўляны прыземісты будынак фальварка пад насунутым высокім дахам. Перад будынкам – ліпы і свечкі пірамідальных таполяў, што ўскінуліся ў неба. За домам відаць кашлаты сад. Сучаснікі не ацанілі алейнай кампазіцыі Дмахоўскага, але спецыялісты годна ацэняць пазней, калі яго карціна «На радзіме (Двор у Нагародавічах)» з прыватнага збору графа Ігнацыя Корвін-Мілеўскага патрапіць на рэтраспектыўную львоўскую выставу 1894 г. *(Маліноўская Т.Р. УСПАМІНЫ Я. БУЛГАКА І ТУГАНАВІЧЫ // ЯН БУЛГАК І КУЛЬТУРА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА РЭГІЁНУ Ў КАНЦЫ XIX ст. ДА ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. Зборнік навуковых артыкулаў. Гродна. 2009. С. 57.)*

Па замове археолага, гісторыка і этнографа Яўстаха Тышкевіча, у 1853 г. Дмахоўскі напісаў серыю відаў руінаў літоўскіх замкаў *(Antoni Grzymala-Przybytko. Krótki przewodnik turystyczny po powiatach Lidzkim i Szczuczyńskim. Lida. 1936. S.30.).* Сярод іх выява Лідскага замка, з якой, відочна, зроблена добра вядомая гравюра "Разваліны замка ў Лідзе", змешчаная ў 3-м томе "Жывапіснай Расіі". Частка з гэтых палотнаў – "Руіны замка ў Медніках", "Руіны замка на Трокскім возеры", "Руіны замка ў Гальшанах" захоўваюцца зараз у Нацыянальным музеі у Кракаве. Серыю малюнкаў літоўскіх замкаў Дмахоўскага успамінае Адам Кіркор у "Літоўскіх старажытнасцях": *"Віленская губерня – цэнтр старажытнага Літоўскага Княства багаты на помнікі мінулага. Дзякуючы таленавітаму віленскаму мастаку Вінцэнту Дмахоўскаму, нам удалося прадставіць хоць некалькі з гэтых помнікаў" (Адам Киркор. Литовския древности // Черты из истории и жизни литовского народа. Вильно, 1854. С. 7—20.).*



В. Дмахоўскі

Сучаснікі В. Дмахоўскага налічвалі ў яго больш за сто пейзажаў і жанравых карцін, якія знаходзілі эмацыйны водгук у мясцовай шляхты і былі папулярнымі ў наваградскіх шляхецкіх сядзібах, сярод іх: «Вуліца ў Вільні», «Замак у Крэве», «Дом Міцкевіча ў Навагрудку», «Сядзіба ў Туганавічах», «На начлезе», «Каля пераправы», «Навагрудак», «Возера Свіцязь» і інш. У першай палове 50-х гадоў Вінцэнт Дмахоўскі афармляў спектаклі ў Віленскім гарадскім тэатры («Галька» Манюшкі, «Італьянка ў Алжыры» Расіні, «Фаварытка» Даніцэці і інш.). Вінцэнта Дмахоўскага называлі «Клод Ларэн віленскіх ваколіц» (Клод Ларэн, 1600–1682, - знакаміты французскі жывапісец і гравёр пейзажаў) бо таксама, як і знакаміты французскі жывапісец XVII ст. ён быў таленавітым мастаком – рамантыкам.

Каля 1840 г. у Вільні В. Дмахоўскі адкрыў мастацкую майстэрню, якая за 20 год працы стала своеасаблівай мастацкай школай, дзе вучыліся многія вядомыя майстры.

Памёр Вінцэнт Дмахоўскі 22 лютага 1862 г. у Вільні. Некралог з жыццярысам знанага мастака, напісаны Ўладзіславам Сыракомлем, быў надрукаваны ў "Курьеры Віленскім" № 18.

Вінцэнт Дмахоўскі меў сына – Уладзіслава Дмахоўскага (вядомы мастак і ілюстратар) і трох дачок *(Bieliński Józef. Uniwersytet Wileński. Kraków. 1899 – 1900. T. II. S. 747.).* Уладзіслаў Дмахоўскі (1838-1913) пачаў вучобу ў Вільні, а з 1857 г. вучыўся ў Парыжы. У 1862 г. ён вярнуўся на радзіму і ўдзельнічаў у паўстанні, за што быў арыштаваны і заключаны ў турму. З 1866 г. жыў у Варшаве, працаваў ілюстратарам часопісаў, а таксама выкладаў малюнак у Варшаўскім Інстытуце глухіх, і з 1873 г. - у гімназіі ў Чэнстахове. У 1884 г. ён атрымаў спадчынны маёнтак Нагародавічы і з тых часоў маляваў усё менш і менш, а галоўным чынам займаўся гаспадаркай.

Неабходна сказаць і пра яшчэ адзін сакральную пабудову ў Нагародавічах, пра якую піша "Слоўнік геаграфічны..." – старажытны касцёл у стылі італьянскага барока пабудаваны ў XVI ст. Першапачаткова гэта быў кальвіністкі збор (бацька мітрапаліта Іосіфа Руцкога – Фелікс Руцкі быў кальвіністам, і будучы мітрапаліт ў маладосці менавіта з кальвінізму перайшоў у унію). З часам касцёл быў закінуты і перагвораны ў склад, а часткова ў жылыя памяшканні і атрымаў назву "скарбец". Згодна са "Слоўнікам геаграфічным...", у варшаўскім часопісе "Каласы" за 1871 ці 1872 гг. друкаваліся малюнкі з відамі "скарбца" *(Słownik Geograficzny Królestwa Polskiego... Warszawa. 1895. T. 14. S. 558.).* Часопіса пакуль знайсці не ўдалося, можна меркаваць, што малюнкі ўладальніка маёнтка, мастака Вінцэнта Дмахоўскага друкаваліся ў артыкуле Е. Хлапіцкага "Малюнкі з тэкі падарожнай" у 1869 г. *(Chlopicki E. Kartki z teki podróżnej // Klosy. 1869. № 9. S. 404.).* Касцёл у Нагародавічах - гэта адна з першых пабудоў у стылі барока на Беларусі.

Дакладна вядома, што да 1939 г. "скарбец" яшчэ існаваў, бо гісторык і краязнаўца Антон Грыжайла-Прыбытка ў 1936 г. пісаў: *"Жылы панскі дом з лістоўніцы, пабудаваны Тызенгаўзам ў сярэдзіне XVIII ст. і добра захаваны "скарбец" – былы кальвінскі збор і касцёл з паловы XVI ст., верагодна пабудаваны Руцкім... У 1569 г. перад Люблінскай уніяй тут быў праведзены з'езд дысыдэнцкіх біскупаў" (Antoni Grzymala-Przybytko. Krótki przewodnik turystyczny po powiatach Lidzkim i Szczuczyńskim. Lida. 1936. S.30.).*

У канцы 1930-х гг. уладальнікам Нагародавіч быў Станіслаў Дмахоўскі, лёс якога невядомы.

Новае выданне

## Паэт яшчэ не пераж ыў свае жаданні





Кандыдат філалагічных навук Уладзімір Сакалоўскі — мой зямляк са Слонімшчыны. Такім земляком я ганаруся, заўсёды радуюся яго новым творчым удачам і новым кнігам. У Беларусі і ў Германіі мойго земляка ведаюць, як перакладчыка і даследчыка літаратуры. Асноўная тэматыка яго даследаванняў — гісторыя развіцця і ўзаемадзеяння беларускай і нямецкай культур. За свой 81 год Уладзімір Сакалоўскі выдаў шмат кніг. Сярод іх — «Пара станаўлення» (1986), «Беларуская літаратура ў ГДР» (1988), «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (1988, у суаўтарстве), «Weißrussische Erzählungen» (2000, укладальнік), «Weißrußland und Deutschland, Bd 1: Bibliographie» (2000). Пераклаў з нямецкай мовы кнігі А. Цеханавецкага «Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме» (1993), Вернера Мюлера «Вырваны з агню» (2002). Аўтар больш за 150 навуковых артыкулаў па беларуска-заходнееўрапейскіх культурных сувязях.

А нядаўна Уладзімір Лявонцьевіч здзівіў мяне. Ён даслаў прыгожы зборнік сваіх… вершаў. Раней я і не ведаў, што акрамя даследаванняў беларуска-нямецкіх сувязей, гэты таленавіты чалавек піша і вершы. "У мяне напісана некалькі тысяч паэтычных радкоў. Пісаў я іх у вольны час. Пішучы вершы — я адпачываў. Цяпер перачытаў напісанае і лепшыя вырашыў выдаць асобным зборнічкам", — прызнаецца Уладзімір Лявонцьевіч. Гэты зборнічак аўтар назваў "Я перажыў свае жаданні". А выйшаў ён з друку ажно ў Нью-Ёрку ў ЗША. Відаць, там ужо танней выдаваць кнігі, чым у нас, у Беларусі.

Умоўна кнігу вершаў Уладзіміра Сакалоўскага можна падзяліць на жанры: лірычны, філасофскі і гумарыстычны. Да лірычнага жанру, а ён распачынае зборнік, аўтар аднёс вершы пра каханне, прыроду, роздумы пра саму паэзію. Магчыма, найбольш паэзіі прызнаецца ў любові паэт, чым жанчыне ў каханні: "Твой прыход — чароўнае імгненне, мой наканаваны шлях і лёс". Так ён звяртаецца да Паэзіі.

Філасофскія разважанні паэта найперш у яго экспромтах. Экспромты — філасофія нашага жыцця:

*Нават сонца не для ўсіх*
*Роўна свеціць, ззяе:*
*Адных лашчыць, саграває,*
*Паліць і пячэ другіх.*

Некаторыя філасофскія экспромты Уладзіміра Сакалоўскага пабудаваны на беларускіх прыказках і прымаўках, якія надаюць вершаваным радкам нейкае сімвалічнае хараство прыказкавых метафар і паэтычную абаяльнасць алегарычных параўнанняў:

*Ой, не выйграць нам мільёны.*
*Свой ты беражы рубель.*
*Лепш сініца у далоні,*
*Чым у небе журавель.*

Цыкл гумарыстычных твораў — гэта разважанні сталага чалавека, творцы, які пражыў нямала і сустракаў на сваім шляху розных людзей, як кажуць, рознага кшталту. З адных аўтар шчыра, без кпінаў смяецца, з іншымі — проста жартуе.

Звяртаюць на сябе ўвагу і вершы, прысвечаныя Германіі, якую паэт ведае не менш за Беларусь, дзе шмат гадоў працаў, якой прысвяціў свае навуковыя даследаванні. Гэта радкі пра Кёльнскі сабор, які "у велічы маўклівай стыне", пра Цюрых, які "да боскага свята нас далучаў", строфы пра Г. Гейнэ.

У адным з вершаў Уладзімір Сакалоўскі напісаў, што "я перажыў свае жаданні, я свае мары разлюбіў…". Мары разлюбіць немагчыма, так, як і перажыць свае жаданні. Няхай вам і надалей светла марыцца і добра пішацца. І ніколі вас не пакідаюць жаданні!

Сяргей ЧЫГРЫН.